УДК 94(476)«14/15»

А. У. Казакоў, асістэнт (БДТУ)

# ЗНАЦЬ З РУСКІХ ЗЯМЕЛЬ НА СЛУЖБЕ Ў ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ (80-Я ГГ. XV – СЯРЭДЗІНА XVI СТ.)

Артыкул прысвечаны пытанню дзяржаўнай службы знаці з рускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім у 80-я гг. XV – сярэдзіне XVI ст. Служба манарху разам з маёмасным становішчам і шлюбнымі адносінамі з мясцовым набілітэтам з'яўляецца адным з асноўных паказчыкаў ступені інтэграванасці эмігрантаў у прывілеяванае саслоўе ВКЛ. Даследаванне заснавана на звестках пра дзяржаўную службу прадстаўнікоў княскіх фамілій і баярскай арыстакратыі, якія змяшчаюцца ў наратыўных і дакументальных гістарычных крыніцах. Аналізуецца служба эмігрантаў з рускіх зямель у вайсковай, дыпламатычнай і адміністрацыйнай сферах.

The article deals with the matters of the state service of nobles from Russian lands in the Grand Duchy of Lithuania during the period from 80th, XV century, to the middle of XVI century. The service for the monarch, along with the property status and conjugal relations with local nobles, is one of the most important indicators of the level of immigrants integration into the privileged part of society of the Grand Duchy of Lithuania. The study is based on data from narrative and documental historical sources, describing the state service of the members of princely dynasties and boyar nobles. The subject of investigation is the state service of immigrants from Russian lands for Grand Dukes of Lithuania in military, diplomatic and administrative (managerial) areas.

**Уводзіны**. Спарадычнае пранікненне знаці з рускіх княстваў у Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ) пачалося яшчэ на досвітку гэтай дзяржавы. Адной з набліжаных да князя Міндоўга асоб быў Яўстафі Канстанцінавіч, які паходзіў з Разані [1, стб. 855]. Але толькі з сярэдзіны XV ст. эміграцыя знаці з рускіх зямель становіцца пастаяннай з'явай, якая знайшла адлюстраванне ў крыніцах. У 1446 г. у ВКЛ прыбыла група васалаў пазбаўленага ўлады вялікага князя маскоўскага Васіля II на чале з князем Бораўскім і Серпухоўскім Васілём Яраславічам, які атрымаў тут вялікія зямельныя ўладанні. З гэтага часу ВКЛ стала традыцыйным прытулкам для апальнай арыстакратыі з Маскоўскай дзяржавы і яе атачэння.

З сярэдзіны XV і да канца 30-х гг. XVI ст. у ВКЛ перасяліліся прадстаўнікі розных пластоў прывілеяванага саслоўя рускіх зямель – ад вялікіх (цвярскі і разанскі) і ўдзельных князёў да дробнай служылай знаці. Масу эмігрантаў можна падзяліць на дзве вялікія катэгорыі: арыстакратыю і драбнейшую знаць. Першая, колькасна меншая, складалася з трох груп – вялікіх і ўдзельных князёў, служылых князёў і баярскай арыстакратыі. У другую ўваходзіла дробная знаць («дзеці баярскія»). Правесці больш дакладную дыферэнцыяцыю апошняй з названых груп не дазваляюць крыніцы. Краінай паходжання абсалютнай большасці эмігрантаў было Вялікае княства Маскоўскае.

Знаць, якая прыбыла ў ВКЛ, насуперак юрыдычна замацаванай забароне атрымлівала з рук вялікіх князёў літоўскіх (гаспадароў) зямельныя ўладанні і станавілася абывацелямі Княства. Яшчэ адным паказчыкам інтэграванасці эмігрантаў у прывілеяванае саслоўе ВКЛ выступае іх дзяржаўная служба. Мэта дадзенай працы – вызначыць, як прадстаўнікі знаці з рускіх зямель (а таксама іх нашчадкі) праявілі сябе на службе ў вялікіх князёў літоўскіх і наколькі дзяржаўныя пасады былі для іх даступныя.

Пытанне эміграцыі знаці з рускіх зямель у ВКЛ трапіла ў поле зроку гісторыкаў яшчэ ў XIX ст., але знаходзілася на перыферыі тэматыкі іх даследаванняў. Становішча эмігрантаў з рускіх зямель у ВКЛ, у прыватнасці іх служба ў вялікіх князёў літоўскіх, да апошняга часу не станавілася прадметам спецыяльнага вывучэння, хоць пэўныя аспекты дзейнасці некаторых эмігрантаў траплялі пад пільную ўвагу даследчыкаў.

**Асноўная частка**. Звесткі пра становішча ў ВКЛ эмігрантаў і іх нашчадкаў за другую палову XV ст. нельга назваць вычарпальнымі. Наяўныя даныя дазваляюць зрабіць пэўныя высновы галоўным чынам адносна эмігрантаў у другім – трэцім пакаленнях. Трэба адзначыць, што Іван Андрэевіч Мажайскі прыбыў у ВКЛ «з детми», г. зн. з сынамі Андрэем і Сямёнам, якія на той момант, верагодна, не дасягнулі сталагадовага ўзросту, а значыць, не з'яўляліся самастойнымі суб'ектамі грамадскіх адносін. Але фактычна яны былі эмігрантамі ў першым пакаленні.

Перш за ўсё, служба арыстакратыі з рускіх зямель ў вялікіх князёў літоўскіх праявілася ў вайсковай сферы. Адзін з князёў Шамячычаў прымаў удзел (верагодна, на чале свайго ўзброенага атрада) у паходзе пад камандаваннем троцкага ваяводы супраць татараў, якія захапілі Кіеў у 1484 г. Сямён Іванавіч Мажайскі разам з уласнымі сіламі ўдзельнічаў ў вайне з Маскоўскай дзяржавай у 1492–1494 гг., дапамагаючы абараняць Сярпейск і Мезецк. У 1497 г. Васіль Іванавіч Шамячыч і С. І. Мажайскі падтрымалі сумесную вайсковую акцыю Польшчы і ВКЛ супраць Малдавіі [2, с. 210; 3, с. 165].

Акрамя таго, Сямён і Васіль Шамячычы трымалі Абалецкую валасць, відаць, выконваючы там функцыі гаспадарскіх намеснікаў [4, с. 298–299]. Ю. Вольф лічыць, што яны рабілі гэта сумесна. Больш верагодным уяўляецца тое, што Васіль стаў спадкаемцам брата ў якасці абалецкага дзяржаўцы пасля яго смерці. Пазней мясцовыя шляхціцы, выступаючы сведкамі ў судах, неаднаразова прыгадваюць час «за князя Ошемячича», але ніколі не называюць яго імя [5, с. 89–91, 92–93, 95].

Эмігрант у другім пакаленні Фёдар Іванавіч Яраславіч удзельнічаў у абароне краю ад татарскіх нападаў. Вядома, што ў 1503 г. войска, якое ён узначальваў разам з князямі Ю. Дубровіцкім і Р. Глінскім, дало няўдалы бой татарам на р. Уша пад Оўручам. Важна, што Яраславіч выступае тут не як статыст, а як адзін з военачальнікаў, прычым крыніца ставіць яго імя на першае месца сярод трох правадыроў войска [3, с. 169]. Верагодна, Фёдар Іванавіч прымаў удзел у акцыі супраць татар і ў 1506 г., якая скончылася пераможнай бітвай пад Клецкам. Прынамсі, тады ён быў асабіста зацікаўлены ў абароне ад крымчакоў, якія спусташалі яго ўласныя ўладанні.

Удалую кар'еру на дзяржаўнай службе зрабіў князь Глеб Юр'евіч Пронскі. Пад 1501 г. ён прыгадваецца ў якасці намесніка астрынскага, пад 1504 г. – бабруйскага [6, с. 97, 267]. У 1508 і 1510 гг. ён займаў пасаду намесніка майшагольскага і адначасова дубінскага. Да адміністрацыйнай рэформы 60-х гг. XVI ст. Майшагола была цэнтрам павета, Дубінкі – цэнтрам валасці Віленскага ваяводства. А. Банецкі бачыць Г. Ю. Пронскага на майшагольскім намесніцтве яшчэ раней – у 1493–1494 гг. [7, s. 260].

У 1504 г. князь Пронскі вызначыўся і на дыпламатычнай службе: ён узначальваў пасольства вялікага князя літоўскага Аляксандра ў Арду. У тым жа годзе яго адправілі сустракаць татарскага пасланніка Бахтыяра мурзу [6, с. 95–97]. Глеб Юр'евіч таксама згадваецца ў перапісе дваран вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога 1509 г. [8, с. 163–166]. У адну з рубрык перапісу занесены імёны тых, хто «слуги свои слали на ласку господарьскую к Волохом» [8, с. 165–166]. Сярод іх асобную групу ўтвараюць некалькі імёнаў пад загалоўкам «А то которые с Пронским были ездили до Волох».

Відаць, Глеб Юр'евіч узначальваў вайсковы атрад, які прымаў удзел у паходзе ў Малдавію. У пачатку XVI ст. Польшча ваявала з гэтай дзяржавай, але ВКЛ, нягледзячы на персанальную унію, падтрымлівала з Малдаўскім княствам мірныя адносіны. Імкнучыся іх захаваць, Рада адмовіла Аляксандру ў вайсковай дапамозе палякам супраць малдаван. Гэта, аднак, не выключала магчымасці для шляхты паўдзельнічаць у польска-малдаўскім канфлікце не ад імя ВКЛ, а ў якасці гаспадарскіх слуг, што і зрабіў Г. Ю. Пронскі. Такое меркаванне пацвярджаецца фармулёўкай «на ласку господарьскау» (г. зн. добраахвотна, а не паводле абавязку) у перапісе дваран 1509 г., а таксама іншым дакументам з Метрыкі ВКЛ. Гэта запіс аб выплатах тым, «которыи служили господару …у Волосех» [8, с. 415–416], датаваны 23 кастрычніка 1509 г. Тут зноў у групу вылучаны асобы, якія «с Пронским ездили». Гэты спіс змяшчае амаль усе імёны, што і адпаведны яму ў перапісе дваран. Вядома, што якраз у 1509 г. адбываліся баявыя дзеянні паміж польскімі і малдаўскімі войскамі ў Пакуцці. За ўдзел у іх Г. Ю. Пронскі атрымаў 40 кап. грошай з вялікакняскага скарбу.

Прадстаўнікі знаці з рускіх зямель, якія эміgravалі ў ВКЛ у канцы XV – 30-х гг. XVI ст., таксама праявілі сябе на службе ў вялікіх князёў літоўскіх. Багаты дакументальны матэрыял за першую палову XVI ст. адлюстроўвае, перш за ўсё, дзейнасць эмігрантаў у адміністрацыйнай сферы.

Даволі паспяховую кар'еру ўрадніка зрабіў князь Мацвей Мікіціініч. У 1502 г. ён згадваецца ў якасці намесніка вялікай княгіні літоўскай Алены Іванаўны ў Княжычах і Цяцерыне. Алена атрымала ад Аляксандра гэтыя ўладанні ў 1501 г. [9, с. 176–177]. Відаць, князь Мацвей з самага пачатку быў прызначаны іх адміністратарам. На 1507 г. ён ужо трымаў ад Алены Іванаўны Магілёў і Бірштаны (Ковенскі павет). Гэтыя населеныя пункты дасталіся ёй у 1503 г. [9, с. 175–176]. У 1507 г. пры пацвярджэнні правоў Мікіцініча на двары Езна, Ганусоўскі і Шлягероўскі Жыгімонт Стары назваў яго яшчэ і намеснікам Алены ў Анікштах [9, с. 181–182].

Блізкасць да вялікай княгіні літоўскай дазволіла М. Мікіцінічу зрабіць кар'еру дзяржаўцы, займаючы пасады намесніка княжыцкага, цяцерынскага, магілёўскага, анікшценскага і бірштанскага. Аднак пазбаўленне пратэкцыі Алены Іванаўны па прычыне яе смерці не спрыяла далейшым поспехам у гэтым накірунку. Тым не менш Мікіцініч быў пакінуты на пасадзе намесніка спалых на гаспадара Бірштан, якія знаходзіліся побач з яго Езненскім дваром [10, с. 154]. Варта адзначыць, што статус Мікіцініча як трымальніка Бірштан быў своеасаблівым. З аднаго боку, ён з'яўляўся арандатарам гэтага маёнтка. З іншага боку, князь Мацвей фігуруе ў крыніцах як бірштанскі намеснік, што было пасадай [10, с. 154]. Гэту пасаду, нягледзячы на ўсе цяжкасці, ён здолеў захаваць да канца жыцця.

На дзяржаўнай службе вызначыўся эмігрант пачатку XVI ст. Іван Цімафеевіч Юрлоў, які паходзіў з маскоўскага баярскага роду Пляшчэевых. Пад 1514 г. ён упершыню згадваецца ў

якасці намесніка Ясваінскай воласці (Жамойць) [10, с. 232]. Яго кар'ера ўрадніка складвалася няпроста. Апошні раз у якасці ясваінскага намесніка ён фігуруе ў 1520 г., а ў 1525 г. гэту пасаду ўжо займаў князь Міхаіл Асавіцкі [11, с. 72]. У дакументах 20-х гг. XVI ст. Іван Цімафеевіч называецца толькі панам і гаспадарскім дваранінам. Юрлоў пазбавіўся ўрада, відаць, па прычыне недахопу грошай у скарбе – Ясваінь была пакінута на жамойцкага біскупа. Жыгімонт Стары, аднак, планаваў пана Івана «лепшим держаньем осмотрети и пожаловати», але нічога адпаведнага не знайшлося. Пазней Ясваінь была аддадзена эгзулянту Асавіцкаму замест адабраных у яго спачатку Дарсунішак, а потым Скерстамоні. Каб неяк кампенсаваць Юрлову страту ўрада «без причины», вялікі князь у 1525 г. выдаў яму «экспектатыву» – прывілей на тое ж ясваінскае намесніцтва, якое павінна было дастацца Івану Цімафеевічу пасля смерці Асавіцкага, а таксама даў яму права мець у сваіх маёнтках чатыры карчмы «з волным шинком ...без плаченя капщизны» [12, с. 388]. Застаецца невядомым, ці вярнуў Юрлоў пасаду да сваёй смерці (апошні раз ён прыгадваецца пад 1528 г. [13, с. 52]). Такім чынам, кар'ера Юрлова як адміністратара складвалася супярэчліва па суб'ектыўнай прычыне – непаслядоўнай палітыцы Жыгімонта Старога па размеркаванні ўрадаў.

Вялікакняскім дзяржаўцам быў апошні вялікі князь разанскі Іван Іванавіч, які знайшоў прытулак у ВКЛ. Ён атрымаў ад Жыгімонта Старога маёнтак Стоклішкі [14, с. 136; 15, с. 105]. Трэба адзначыць, што статус дзяржаўцы, з аднаго боку, павінен быў забяспечваць даход. З іншага, дзяржаўца мусіў ажыццяўляць адміністратарскія функцыі ў тых гаспадарскіх маёнтках, якія знаходзіліся ў яго трыманні; у гэтым сэнсе ён выступаў намеснікам вялікага князя ў даручаных яму ўладаннях.

Дзяржаўцам у шэрагу маёнткаў – Кармялаве, Жыжморах і тых жа Стоклішках пасля смерці І. І. Разанскага – быў князь Сямён Фёдаравіч Бельскі [16, s. 398; 17, прил., с. 34]. Аднак больш удалую кар'еру ўрадніка зрабіў яго таварыш па ўцёках з Маскоўскай дзяржавы Іван Васільевіч Лядскі – былы акольнічы маскоўскага вялікага князя Васіля III. Праз 10 гадоў пасля атрымання пасады намесніка высакадворскага і жалудоцкага, у 1546 г., ён прыгадваецца ў якасці намесніка медніцкага, што стала павышэннем на дзяржаўнай службе [18, s. 71]. У спісе дзяржаўцаў Віленскага і Троцкага ваяводстваў 1536 г. намеснік высакадворскі і жалудоцкі знаходзіўся на 13-м месцы, а намеснік медніцкі – на першым [17, прил., с. 33]! Такім чынам, Лядскі заняў першае месца ў іерархіі павятовых ураднікаў Віленскага ваяводства. Двойчы, у 1536 і 1538 г., ён атрымліваў ад вялікага князя ўзнагароду за службу ў выглядзе грошай і матэрыяльных каштоўнасцей [19, арк. 37 адв., 38 адв. – 39]. Такім жа чынам быў пажалаваны і яго сын Іван [19, арк. 37 адв.; 20, арк. 125 адв.].

Іншай сферай дзейнасці, у якой вызначыліся выхадцы з рускіх зямель, была вайсковая.

У прывілеі 1526 г. І. Ц. Юрлову на ясваінскае намесніцтва былі адзначаны яго заслугі. Ён неаднаразова прымаў удзел у баявых дзеяннях супраць Маскоўскай дзяржавы, у тым ліку ў бітве пад Оршай 1514 г. [12, с. 468]. Падчас сваёй вайсковай дзейнасці на карысць ВКЛ ён нават патрапіў у маскоўскі палон, адкуль вызваліўся пры нявысветленых абставінах [21, арк. 310].

Наступным прыкладам удзелу эмігрантаў у войнах на баку ВКЛ супраць сваіх учарашніх гаспадароў з'яўляецца выпадак Бельскага і Лядскага. І той, і іншы аказалі дапамогу ВКЛ у паспяховай кампаніі 1535 г. падчас Старадубскай вайны (1534–1537 гг.). Паказальна, што яны атрымалі персанальнае паведамленне аб скліканні войска; рабілася гэта, як правіла, у адносінах да буйной шляхты [15, с. 181]. Простым удзелам у баявых дзеяннях іх заслугі, аднак, не абмяжоўваліся. Як былыя маскоўскія ваеначальнікі Бельскі і Лядскі паслужылі важнай крыніцай інфармацыі аб непрыяцельскіх сілах і аб становішчы ў Маскоўскай дзяржаве. Сам Жыгімонт Стары быў вельмі ўзрадаваны, калі даведаўся аб пераходзе гэтых асоб на бок ВКЛ [22, с. 108, 110].

Варта асобна ўзгадаць аб крымскай авантуры С. Ф. Бельскага. Нягледзячы на тое, што яго ад'езд з мэтай ажыццяўлення ўласных планаў не быў санкцыянаваны Жыгімонтам Старым, падчас знаходжання ў Крыме ён дзейнічаў і на карысць ВКЛ, за што атрымаў ад вялікага князя літоўскага падзяку і падтрымку. Пікам гэтай дзейнасці стаў удзел у паходзе супраць Масквы 1541 г., які, як уяўляецца, і быў інспіраваны Бельскім.

За час знаходжання ў Крыме С. Ф. Бельскі, безумоўна, стаў носьбітам важнай інфармацыі аб стане спраў у тамтэйшым ханстве, якая магла спатрэбіцца кіруючым колам ВКЛ. Менавіта гэтым можна патлумачыць тое, што Бельскі ў 1542 г. атрымаў ад Жыгімонта Старога распараджэнне з'явіцца на сойм «до панов рад наших». Верагодна, ён быў прыцягнуты да пасяджэнняў вялікакняскай Рады ў якасці кансультанта. Меркаванне аб тым, што Бельскі ўваходзіў у гаспадарскую Раду, не мае дастатковых доказаў.

**Заключэнне**. Эміграны з рускіх зямель, а таксама іх нашчадкі, праявілі сябе на службе ў вялікіх князёў літоўскіх, вызначыўшыся ў вайсковай, дыпламатычнай і адміністрацыйнай сферах. Несумненна тое, што, нягледзячы на іншаземнае паходжанне, чужынцы мелі магчымасці зрабіць кар'еры ў ВКЛ. Удзел ва ўзброе-

ных канфліктах быў для эмігрантаў не толькі абавязкам, які ляжаў на ўсіх землеўладальніках краіны, і не толькі сродкам атрымання пажалаванняў, але і праяўленнем лаяльнасці новай уладзе, асабліва калі справа тычылася войнаў супраць іх ранейшага гаспадара – вялікага князя маскоўскага. Удзел некаторых эмігрантаў (Шамячычаў, І. Ц. Юрлова, І. І. Разанскага, С. Ф. Бельскага, І. В. Лядскага) у мясцовым кіраванні сведчыць пра тое, што дзяржаўныя пасады таксама былі для іх даступныя. Прычым атрыманне гэтых пасад адбывалася насуперак афіцыйнай забароне: іншаземцы не мелі права іх займаць. Дзейнасць эмігрантаў на дзяржаўнай службе сведчыць аб іх паспяховай інтэграцыі ў прывілеяванае саслоўе ВКЛ.

## Літаратура

1. Полное собрание русских летописей. – СПб.: Археогр. комис., 1843. – Т. 2: Ипатьевская летопись. – IX, 377, [4] с.

2. Полное собрание русских летописей. – Петроград: 2-я гос. тип., 1921. – Т. 24: Типографская летопись. – XI, 271 с.

3. Полное собрание русских летописей. – М.: Наука, 1975. – Т. 32: Хроники: Литовская и Жомойтская и Быховца; летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / отв. ред. Б. А. Рыбаков; сост. и ред. тома Н. Н. Улащик. – 233 с.

4. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: в 15 т. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1863–1892. – Т. 1 / ред. Н. И. Костомаров, Г. Ф. Карпов. – 1863. – 301, 15 с.

5. Беларускі архіў. – Мінск: Археагр. каміс. – Т. 2 (XV–XVI). Літоўская метрыка / Ін-т бел. культуры, аддз. гуманітарных навук; уступ. арт. З. Даўгялы. – L, 341 с.

6. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 6 (1494–1506) / Parengė A. Baliulis. – Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2007. – 516 p.

7. Boniecki, A. Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI w. / A. Boniecki. – Warszawa: Druk J. Bergera, 1887. – XVI, 426, L s.

8. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 8 (1499–1514) / Parengė A. Baliulis [ir kt.]. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1994. – 649 p.

9. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 25 (1387–1546) / Parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1998. – 460 p.

10. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 9 (1511–1518) / K. Pietkiewicz. – Vilnius: Žara, 2002. – 615 p.

11. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 10 (1440–1523) / Parengė E. Banionis, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų liedybos institutes, 1997. – 178 p.

12. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 12 (1522–1529) / Parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Žara, 2001. – 854 p.

13. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кн. 523; Кн. Публічных спраў 1 / падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 444 с.

14. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 224 (1522–1530) / I. Valikonitė, S. Lazutka [ir kt.]. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1997. – 664 p.

15. Lithuanian Metrica. Литовская Метрика. Lietuvos Metrica: Kn. 227 (1533–1535) / I. Valikonitė, S. Lazutka [ir kt.]. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 1999. – 400 p.

16. Kronika Polska, Litewska, Zmodzka i Wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego. Wydanie nowe, będące dokładnem powtorzeniem wydania pierwotnego krolewieckiego z roku 1582. – Warszawa: Nakł. G. L. Glucksberga, 1846. – T. 2. – 563 s.

17. Любавский, М. К. Литовско-русский сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М. К. Любавский. – М.: Имп. о-во истории и древностей рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232, LXXII с.

18. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: spisy: [w 10 t.] / Inst. Historii Pol. Akad. Nauk. – Warszawa: Wydaw. DiG, 2003–2004. – T. 1: Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek / pod red. A. Rachuby; oprac.: H. Lulewicz [i inne]. – 2004. – 764 s.

19. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 21. «Тые справы початы у книги вписаваны быти приехавши королю его милости и великому князю Жикгимонту до Кракова з ВКЛ лета 1536, мца ноября 22 дня, инд. 10 за пана Михайла, писара». Перапісана. 1536–1537 гг.

20. НГАБ. – Фонд. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 23. Прывілеі, пажалаванні і судовыя рашэнні. Перапісана. 1538–1540 гг.

21. НГАБ. – Фонд. КМФ-18. – Воп. 1. – Спр. 7. «Книга справ поселских, так теж данин и иных листов поточных за панованья короля его милости Жикгамонта Старога» 1444–1549 гг.

22. Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVI вв. – Т. VI. Радзивилловские акты из собрания Российской Национальной библиотеки. Первая половина XVI в. / сост. М. М. Кром; редкол.: И. Граля [и др.]. – М.; Варшава: Древлехранилище, 2002. – 267 с.

*Паступіў 02.04.2010*